Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка

Мінск, 25 кастрычніка 2002 г.

Выпуск 2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2002

сягнулі высокага ўзроўню дыпламатычнага ўплыву ў Еўропе, Германія стала цэнтрам палітычнага і тэрытарыяльнага пераўстройства свету.

Па-трэцяе, пачынаючы з часу заключэння антыкамінтэрнаўскага пакта, у міждзяржаўнай палітыцы захаду наглядаецца імкненне ізаляцыі ўплыву Савецкага Саюза на сусветныя працэсы. Пры іх падтрымцы Германія заключала дамоўленасці, якія былі накіраваны супраць СССР, што не дазволіла еўрапейскім краінам стварыць сістэму калектыўнай бяспекі ў Еўропе.

Па-чацвертае, Савецкі Саюз шукаў шляхі выхаду з палітычнай ізаляцыі, разумення і падтрымкі з боку Англіі і Францыі. Аднак яго намаганні засталіся не запатрабаванымі і не мелі падтрымкі з боку буйнейшых краін Захаду.

Па-пятае, сучасныя заходнія гісторыкі вельмі "панарамана" (а фактычна спрошчана) апісваюць міждзяржаўныя адносіны напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, як сукупнасць вялікіх драматычных падзей, ігнаруючы фон і агульны кантэкст гістарычнага развіцця, дзеянні савецкіх узброенных сіл, перакладваючы ўсю віну на СССР. Аднабокасць у падыходзе заходніх гісторыкаў тлумачыцца тым, што яны ігнаруюць савецкія крыніцы і не змаглі ў поўным сэнсе аб'ектыўна і ва ўзаемасувязі ацаніць рашэнні і дзеянні дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва СССР.

Па-шостае, падпісаныя ў перадваенныя гады дагаворы адпавядалі вопыту і традыцыям міжндзяржаўных адносін, якія мелі месца і склаліся ў 30-я гады XX стагоддзя. Большасць пактаў, якія былі заключаны, мелі экспансіўны характар і накіраванасць, не адрозніваліся юрыдычнай канкрэтнасцю. Не былі выключэннем мюнхенскі, савецка-германскі і іншыя дагаворы.

Па-сёмае, падзеі пачатку Другой сусветнай вайны, германская агрэсія супраць СССР аказалі значны ўплыў на развіццё міждзяржаўных адносін, паглыбленне даверу і ўзаемапаразумення паміж еўрапейскімі краінамі. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны не пазбавіў Германію пагрозы вайны на два фронта, насупраць, гэта пагроза яшчэ больш узрасла. Гітлераўскае кіраўніцтва недаацаніла ўнутраную стабільнасць савецкай сістэмы, высокі патрыятычны дух народаў СССР. Гераізм, стойкасць і, мужнасць салдатаў і камандзіраў Чырвонай Арміі з'явіліся адным з рашаючых фактараў на шляху стварэння антыгітлераўскай кааліцыі, забяспечылі ўпэўненасць міжнароднай грамадскасці ў магчымасць разгрому германскага нацызма.

### Літаратура


1. Документы и материалы кануна второй мировой войны. 1937-1939. Т. 1-2. М., 1948.
2. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентом США и премьер-министром Великобритании во время Великой Отечественной войны. 1941-1945 гг. В 2-х т. Изд. 2. М., 1976.
3. Год кризиса. 1938-1939. Документы и материалы в двух томах. М. 1990.
4. Розанов Г.Л. Сталин - Гитлер. Документальный очерк советско-германских дипломатических отношений. 1939-1941 гг. М. 1991.
5. GLANTZ D.M., HOUSE J.M. When Titans Clashed. How the Red Army Stopped Hitler. Lawrence. 1995.
6. GLANTZ D.M. Stumbling Colossus. The Red Army on the Eve of World War. Lawrence. 1998.
7. Harrison R.W. The Russian Way of War: operation art. 1941-1945. Lawrence, Kan: University Press of Kansas. 2001.
8. Dallin A. German rule in Russia, 1941-1945; a study of occupation polices. 1957.






## МЕТАДАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.

### ВЫТОКІ СТАНАЎЛЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ ШКОЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

**І. І. Багдановіч, Мінск**

Станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі на Беларусі, у тым ліку і гістарычнай, адбывалася ў вельмі неспрыяльных гістарычных умовах. Па – першае, пры адсутнасці беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай школы, па – другое пры поўным адмаўленні з боку ўрада Расійскай імперыі беларусам у праве на культурна – нацыянальную самастойнасць і афіцыйнае ўжыванне ў грамадска – культурным жыцці, у тым ліку і ў школе, роднай мовы.

Нягледзячы на гэта станаўленне гістарычнай адукацыі ішло і было не выпадковым. Да пачатку XX стагоддзя, дзякуючы намаганням інтэлігенцыі Беларусі другой палавіны папярэдняга стагоддзя, у часткі насельніцтва ўжо сфарміравалася нацыянальная свядомасць. Другой важнейшай перадумовай узнікнення нацыянальнай гістарычнай адукацыі стала фарміраванне беларускай гістарыяграфіі.

У канцы XIX – пач. XX стагоддзя вяліся грунтоўныя даследаванні па гісторыі, эканоміцы, этнаграфіі і культуры Беларусі. Гэта працы А.С. Дэмбавіцкага, У.Б. Антановіча, М.В. Доўнар – Запольскага, Я.Ф. Карскага, Н.Я. Нікіфароўскага, М.К. Любаўскага, У.І Лаппо, У.К. Стукаліча, П.В. Уладзімірава, П.В. Шэйна і іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі Беларусі. Інтэнсіўна развівалася краязнаўства. Шырока вядомымі сталі працы Д.І. Даўгялы, А.П. Сапунова, Я.Р. Раманава, А.Я. Багдановіча і іншых выдатных даследчыкаў роднага краю. Знаемства новага пакалення беларускай інтэлігенцыі, якое сфарміравалася з народных настаўнікаў – выпускнікоў Маладзечанскай, Нясвіжскай, Свіслачскай і Полацкай настаўніцкіх семінарый з працамі гэтых даследчыкаў стварыла перадумовы станаўлення беларускай нацыянальнай сістэмы народнай адукацыі ў тым ліку і гістарычнай.

Ствараюць першыя кнігі для чытання для дзяцей беларусаў Я. Купала, Я. Колас, Э. Пашкевіч (Цетка). У іх яны змяшчаюць кароценькія апавяданні і вершы, якія давалі першапачатковыя элементарныя ўяўленні аб гістарычным мінулым беларускага народа, выхоўвалі ў вучняў любоў да роднага краю, вучылі іх шанаваць яго традыцыі, мову і культуру. Зразумела, што ў гэтых, прызначаных для навучання грамаце кніжачках не ўтрымлівалася сістэматычных ведаў па гісторыі Беларусі, ды і мэта напісання іх была зусім іншая – навучыць дзяцей чытаць на роднай мове, а не фарміраваць у іх гістарычныя веды. Тым не меньш нельга недаацаніць іх ролю ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці і элементарных ведаў па гісторыі роднага краю.

Пачынальнікам стварэння нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі на Беларусі па праву з'яўляецца выдатны вучоны і патрыет Вацлаў Ластоўскі.У 1910 годзе ў Вільні ен выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі". Як справядліва зазначыў вядомы беларускі гісторык А. Грыцкевіч, гэта быў першы сістэматычны нарыс па гісторыі Беларусі створаны беларусам і для беларусаў.У ім упершыню, з нацыянальных пазіцый выкладзена гісторыя нашай Бацькаўшчыны. В. Ластоўскі імкнуўся данесці чытачам, што беларускі народ мае сваю ўласную шматвекавую і багатую гісторыю, якую трэба ведаць і якой можна ганарыцца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Абвінавачванні В. Ластоўскага ў суб'ектывізме і скажонай трактоўцы фактаў, тэндэнцыйнасці іх падбора, на наш погляд, не маюць пад сабой ніякіх падстаў, бо ён грунтаваўся на тых гістарычных даследаваннях, тых поглядах і высновах, якія існавалі ў тагачаснай рускай, польскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Яго заслуга ў тым, што ён першым паспрабаваў адабраць з гістарычнага мінулага і сістэматызаваць тое, што сведчыла аб наяўнасці адметнага гістарычнага шляху, які прайшоў беларускі народ са старажытнасці да пачатку XX стагоддзя.

Аналізуючы змест кнігі В. Ластоўскага трэба адзначыць, што падыходзіць да яе з сучаснымі меркамі нельга. Ствараючы гэту кнігу, аўтар не ведаў і не мог ведаць тых фактаў і ацэнак, якія вядомы сучаснай гістарычнай навуцы. Трэба мець на ўвазе тое, што В. Ластоўскі не праводзіў спецыяльных гістарычных даследаванняў, а адаптаваў для шырокага кола чытачоў сучасную яму гістарычную навуку. Гэта не гістарычнае даследаванне, а папулярнае вучэбнае выданне. Сучаснаму чытачу кідаюцца ў вочы шматлікія фактычныя памылкі і недакладнасці ў змесце гэтага дапаможніка, аднак усе гэта не змяншае яго значэння для свайго часу і станаўлення нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі і гістарычнай адукацыі.

Найважнейшай заслугай В. Ластоўскага, на наш погляд, з'яўляецца тое, што ён змог у сваей кнізе пераканаўча паказаць, што тысячагадовая нацыянальная спадчына беларусаў хаваецца за нерасшыфраванымі ў той час тэрмінамі "рускі" і "літоўскі". Іменна гэта ўводзіла ў зман не толькі людзей недасведчаных, але і гісторыкаў. Гэтая тэрміналагічная заблытанасць часта выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца ў нашы дні каб прынізіць нацыянальную гісторыю беларусаў. Аб тым, што гэта кніжка з'яўляецца першым вучэбным дапаможнікам па гісторыі Беларусі сведчыць тое, што яе аўтар змяшчае ў ей ілюстрацыі, партрэты, фатаграфіі і суправаджае іх аўтарскім тэкстам, а ў прадмове да яе піша: "Працу гэту ахвярую сынам маладой Беларусі, каб хаця з гэтай кароткай і няпоўнай працы маглі пазнаваць гісторыю бацькаўшчыны ў свaей роднай мове".

Такім чынам, характар працы В. Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі" сведчыць аб тым, што гэта выданне прызначалася для адукацыйных мэтаў і, бясспрэчна, можа лічыцца першай вучэбнай кнігай па гісторыі нашай Радзімы. Тым больш, што ў гады першай сусветнай вайны, калі ў Заходняй Беларусі з дазволу нямецкіх акупацыйных улад пачалі адчыняцца першыя беларускія школы, кніга В. Ластоўскага стала першым вучэбным дапаможнікам па айчыннай гісторыі, якую вывучалі навучэнцы гэтых школ. У гады ваеннага ліхалецця гаварыць аб сістэматычнай гістарычнай адукацыі на Беларусі не прыходзіцца, бо нават тыя беларускія школы, якія былі адчынены, не маглі нармальна працаваць не толькі па прычыне ваенных дзеянняў, але і па прычыне адсутнасці падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і нацыянальна свядомых кадраў настаўнікаў.

Нельга не адзначыць вялікі ўплыў працы В. Ластоўскага на станаўленне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі, на дзейнасць яго паслядоўнікаў. Адным з непасрэдных паслядоўнікаў і прадаўжальнікаў яго справы стварэння падручніка айчыннай гісторыі стаў Ў.М. Ігнатоўскі, які ў 1915 годзе пачаў работу над стварэннем свайго "Кароткага нарыса гісторыі Беларусі", вытрымаўшага шэсць выданняў.

У дваццатыя гады XX стагоддзя гэты нарыс стаў найбольш вядомым вучэбным дапаможнікам па гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Ен шырока ўжываўся ў школах і сярэдніх навучальных установах. Аднак кніга Ў.Ігнатоўскага, як і праца В. Ластоўскага, таксама не з'яўляецца навуковым даследаваннем, а ўяўляе сабой папулярнае выданне па гісторыі ў аўтарскім бачанні, якое ўтрымлівае шматлікія фактычныя недакладнасці і не вельмі ўдалую спробу інтэрпрэтацыі беларускай гісторыі з пазіцый марксізма.



Разам з тым заслуга Ў.Ігнатоўскага ў тым, што ён зрабіў наступны крок ў накірунку станаўлення нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі на Беларусі. Нельга не адзначыць велізарны ўклад Ў. Ігнатоўскага ў справу развіцця гістарычнага краязнаўства і гістарычнай навукі, што стварала спрыяльныя ўмовы фарміравння беларускай гісторыяграфіі і нацыянальнай самасвядомасці ў 20-я – 30-я гады XX стагоддзя.

## РАЗВИТИЕ МЕТОДОЛОГИИ ИСТОРИИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

**О. В. Башаримова, Гродно**

События второй половины 80-х годов привели к переосмыслению старых идеологических представлений и подходов к изучению истории, показали ошибочность многих исторических концепций. Начало 90-х годов характеризуется ростом активности белорусских учёных в области изучения "белых пятен" в истории своего народа. Свидетельство этому – международные и республиканские конференции, где активно делаются попытки с участием учёных Польши, России, Литвы, Англии, США и др. стран развязать некоторые тугие узлы белорусской истории. Историками также обсуждаются такие вопросы, как специфика исторического исследования, современные модели исторического процесса, соотношение между формационным, цивилизационным, технологическим подходами к интерпретации истории, национальная концепция исторического образования в Республике Беларусь, методологические аспекты важнейших исторических событий. На сегодняшний день в Минске уже состоялись две Международные научные конференции, посвящённые теоретико-методологическим проблемам исторического познания. Материалы этих конференций вошли в специальные сборники, вышедшие в издательстве БГУ [4, 12]. Во втором сборнике впервые в единых комплексах и едином массиве собраны материалы историков, философов, социологов, психологов, филологов, математиков и информатиков, что отвечает происходящей в исторической науке трансформации в сторону антропологии и междисциплинарности.

Необходимо выделить те проблемы, которые сегодня как никогда остро волнуют всех, кто так или иначе имеет отношение к исследованию отечественной истории: это гуманизация исторической науки, методологизация исторического мышления, интеграционные процессы в науке и, как результат, формирование критического отношения к интерпретации истории.

Методология – это определённая исследовательская программа, базирующаяся на методах и задающая концептуальное видение изучаемой предметности, обеспечивающая ей научную осмысленность. Значение методологии истории для исторической науки состоит в том, что она определяет как характер индивидуального процесса познания, так и пути развития исторической науки в целом. Таким образом, отсюда вытекает необходимость всесторонней проработки теоретико-методологических вопросов исторической науки. "Современный этап в развитии отечественной историографии характеризуется переосмыслением её исходных теоретико-методологических установок, поиском новых концепций интерпретации истории" [5, 4]. История сегодня оказывается под воздействием различных, в основном плодотворных концептуальных подходов с использованием разнообразных и перспективных методов анализа исторического материала. Изучение этих разнообразных подходов включено сегодня в программу курса "Методология истории".



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ